ВЕЧНА ЮНАМУ ЛЕНІНСКАМУ КАМСАМОЛУ 50 ГОД

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 29 (720) ● Пятніца, 25 кастрычніка 1968 г. ● Год выдання XXI Цана 2 кап.

**ГАРАЧАЕ ПРЫВІТАННЕ І САРДЭЧНЫЯ ВІНШАВАННІ КАМСАМОЛЬЦАМ І КАМСАМОЛКАМ, УСІМ ЮНАКАМ І ДЗЯЎЧАТАМ У ДНІ СЛАЎНАГА ЮБІЛЕЮ УСЕСАЮЗНАГА ЛЕНІНСКАГА КАМУНІСТЫЧНАГА САЮЗА МОЛАДЗІ!**

*(З ЗАКЛІКАЎ ЦК КПСС ДА 51-й ГАДАВІНЫ ВЯЛІКАЙ КАСТРЫЧНІЦКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ).*




## ПАДАРУНКІ ЮБІЛЕЮ

У гэтыя дні на курсах і на факультэтах ідуць урачыстыя сходы, прысвечаныя 50-годдзю ВЛКСМ. Камсамольцы ўніверсітэта падводзяць вынікі сацыялістычнага спаборніцтва ў гонар юбілею, расказваюць, з якімі падарункамі яны сустракаюць свята. А расказаць ёсць аб чым. Вось некалькі вытрымак з рапарту ўніверсітэцкай камсамоліі:

Каля тысячы камсамольцаў здалі экзамены ў мінулую сесію толькі на выдатна, сем з іх атрымоўваюць Ленінскія стыпендыі, пяць— стыпендыі імя К. Маркса, два — імя Я. Коласа і адзін — Купалаўскую. Ва ўніверсітэце многа груп і курсаў, студэнты якіх займаюцца на добра і выдатна.

Дзесяткі студэнтаў-камсамольцаў прынялі ўдзел у другім Рэспубліканскім конкурсе студэнцкіх прац па праблемах грамадскіх навук, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху. З 64 работ, аднесеных да першай катэгорыі, 15 належаць універсітэцкім аўтарам. Усе яны ўзнагароджаны каштоўнымі падарункамі, граматамі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР і ЦК ЛКСМБ. На факультэтах прайшлі навуковыя канферэнцыі, прысвечаныя юбілею камсамола, у якіх прыняло ўдзел звыш 500 студэнтаў-дакладчыкаў.

1850 чалавек — такую колькасць студэнтаў нашага ўніверсітэта склаў зводны атрад працоўнага семестра. Нашы студэнты ўзводзілі будоўлі ў Беларусі, стэпах Казахстана, Эстоніі, Цюмені, Нарыльску, у Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы. Імі асвоена паўтара мільёна капіталаўкладанняў. Такога поспеху яшчэ не ведаў ні адзін год. Толькі адзін невялікі атрад юрыстаў «Феміда» пабудаваў сем дамоў і заваяваў пераходны Чырвоны Сцяг уральскага будаўнічага атрада. Грамату ЦК Саюза Свабоднай Нямецкай Моладзі прывезлі камсамольцы з міжнароднага атрада. ЦК камсамола Беларусі высока ацаніў уклад нашага студэнцтва ў выніку ўсесаюзнага працоўнага семестра.

Штогод універсітэт заканчваюць сотні юнакоў і дзяўчат, і сярод іх ёсць нямала камсамольскіх актывістаў, выхаваных ардэнаносным калектывам. Толькі ў гэтым годзе на факультэт грамадскіх прафесій запісалася звыш 500 чалавек.

Лічбы, факты... У рапартах камсамольцаў універсітэта яны гучаць песняй, здравіцай у гонар Камуністычнай партыі, пад кіраўніцтвам якой жыве і працуе Ленінскі камсамол.

## ЗАСЛУЖАНЫЯ ЎЗНАГАРОДЫ

**Авеяны рамантыкай летапіс захоўвае скупыя радкі аб тых узнагародах, якімі Радзіма адзначыла Усесаюзны Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі за 50 год яго гісторыі. Пяць ордэнаў на камсамольскім сцягу — гэта яркае сведчанне выдатных заслуг савецкай моладзі.**

**Вось гэтыя памятныя даты.**

**23 ЛЮТАГА 1928 ГОДА за бяспрыкладны гераізм у гады грамадзянскай вайны і замежнай інтэрвенцыі камсамол быў узнагароджан першым ордэнам—ордэнам Чырвонага Сцяга. Высокая ўзнагарода была ўручана Ленінскаму Саюзу Моладзі ў маі 1928 года на VIII з'ездзе ВЛКСМ.**

**21 СТУДЗЕНЯ 1931 ГОДА, адзначаючы ініцыятыву ў справе ўдарніцтва і сацыялістычнага будаўніцтва, якія забяспечылі паспяховае выкананне першага пяцігадовага плана развіцця народнай гаспадаркі краіны, Савецкі ўрад узнагародзіў камсамол другім ордэнам — Працоўнага Чырвонага Сцяга.**

**14 ЧЭРВЕНЯ 1945 ГОДА камсамолу ўручана самая высокая ўзнагарода. Ордэнам Леніна адзначаны яго заслугі перад Радзімай у гады Вялікай Айчыннай вайны.**

**ТРЫЦЦАЦІГО ДДЗЕ КАМСАМОЛА святкавала ўся краіна.**

**«За выдатныя заслугі перад Радзімай у справе камуністычнага выхавання савецкай моладзі і актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве ў сувязі з 30-годдзем з дня заснавання ВЛКСМ, узнагародзіць Усесаюзны Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі ордэнам Леніна» — абвяшчаў Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. Чацвёрты ордэн заззяў на сцягу камсамола.**

**У 1956 ГОДЗЕ трэцім ордэнам Леніна Радзіма ацаніла ўдзел камсамола ў камуністычным будаўніцтве.**

П. БРОЎКА.

## З юначых дзён

Тых дзён ход мужны і суровы  
І пазабудзецца калі —  
Як жыў наш горад павятовы,  
Як маладыя мы жылі.

Было: у час вялікіх святаў  
Мы дэманстрацыяй ішлі,  
Хлопцы ў юнгштурмаўках, дзяўчаты,  
Здаецца, з песняю раслі.

Ішоў па бруку цвёрда, горда  
Камуністычны наш Саюз —  
Пілсудскага крывую морду  
Трымалі мы за доўгі вус.  
Ну і, вядома, што нязменна  
Быў і Дзянікін і Махно,  
З праткнутым задам Чэмберлена  
Насілі з імі заадно.  
А «Блуза Сіняя» складала  
Раёк на хуткую руку —  
Ад іх нямала пападала  
Папу, буржую, кулаку.  
У грудзях быў запал бунтоўны,  
Хоць марш давай — па ўсей зямлі...  
Мы не мыляліся ў асноўным,  
Мы сэрцам з Леніным жылі.

## СА СВЯТАМ, ДАРАГІЯ СЯБРЫ!

**Праз тры дні васьмітысячная армія камсамольцаў нашага ўніверсітэта разам з усім савецкім народам і прагрэсіўнай моладдзю свету адзначыць паўвекавы юбілей ВЛКСМ.**

**Рэктарат, партыйны камітэт, мясцком, прафесары і ўсе выкладчыкі бачаць у камсамольцах сваіх паўсядзённых памочнікаў у барацьбе за трывалыя і глыбокія веды студэнтаў, у падрыхтоўцы ідэйна загартаваных і высокакваліфікаваных спецыялістаў. Камсамол нашага ардэнаноснага ўніверсітэта выхаваў нямала вядомых у рэспубліцы і ва ўсёй краіне вучоных, партыйных і грамадскіх дзеячоў, пісьменнікаў, паэтаў, настаўнікаў. Цяпер ён разам з рэктаратам, партыйнай і прафсаюзнай арганізацыямі паспяхова здзяйсняе пастановы і ўказанні ЦК КПСС па далейшаму развіццю вышэйшай адукацыі ў краіне, паляпшэнню ўсёй выхаваўчай работы сярод моладзі.**

**Сардэчна віншуем вас, члены Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі, з 50-годдзем ВЛКСМ і жадаем новых выдатных поспехаў у вучобе, глыбокага авалодання марксісцка-ленінскай тэорыяй, спецыяльнымі дысцыплінамі, у выкананні велічнай праграмы выхавання падрастаючага пакалення, якая намечана ў Пастанове ЦК КПСС да юбілею камсамола.**

**Будзьце дастойны працоўнай і баявой славы бацькоў!**

**РЭКТАРАТ,  
ПАРТКОМ,  
МЯСЦКОМ.**

## МЫ РАЗАМ З ВАМІ

Мы, в'етнамскія студэнты, вельмі рады, што разам з савецкай моладдзю будзем святкаваць 50-годдзе камсамола. Слаўную, гераічную гісторыю мае ваша моладзь. Выконваючы запаветы У. І. Леніна, яна прайшла вялікі шлях барацьбы, вучобы і працы, заўсёды аддавала і аддае свае ўсе сілы шчасцю народа.

Камсамол Краіны Саветаў можа ганарыцца тым, што партыя даручае яму самыя адказныя задачы. Аб тым, як ён выконвае іх, сведчыць узнагароджанне пяццю ордэнамі, высокая ацэнка дзейнасці камсамольскіх арганізацый, якая дана ў Пастанове ЦК КПСС. Хочацца адзначыць, што камсамольцы і камсамолкі СССР аказваюць вялікую дапамогу в'етнамскаму народу ў яго барацьбе супраць амерыканскіх агрэсараў. Многія з іх узнагароджаны нашым урадам. Да таго ж в'етнамскія юнакі і дзяўчаты вучацца ў сваіх савецкіх братоў і сясцёр мужнасці, адданасці ідэям камунізма.

Юбілей ВЛКСМ — гэта не толькі свята братоў, яно і наша свята. Наш абавязак — выдатна вучыцца, у працы і барацьбе браць прыклад з Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі.

Чан Хыу Фук,  
студэнт I курса матфака.

## Пераклічка пакаленняў



*За паўвека сто мільёнаў савецкіх людзей у юныя гады прайшлі школу камсамола, школу барацьбы і працы, школу ленінскага выхавання будаўнікоў новага жыцця. Не дзіўна таму, што юбілей камсамола з'яўляецца ўсенародным святам. Гэтымі словамі старэйшага члена Ленінскага Саюза Моладзі, былога генеральнага сакратара ЦК ВЛКСМ Аляксандра Іванавіча Мільчакова мы адкрываем сёння тэматычную падборку матэрыялаў «Пераклічка пакаленняў» (3—4 старонкі). Лёс кожнага з аўтараў гэтых матэрыялаў цесна звязан з гераічнай гісторыяй камсамола. Па сутнасці яны творцы гэтай гісторыі.*

(3—4 старонкі)





# 5000 КІЛАМЕТРАЎ

## ПА ДАРОГАХ КАМСАМОЛЬСКАЙ СЛАВЫ

*Мінулым летам па рашэнню ЦК ЛКСМБ быў арганізаван агітпаход Мінск — Запаляр'е па дарогах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкай моладзі. У састаў групы ўвайшлі маладыя навуковыя супрацоўнікі Мінска, у тым ліку і прадстаўнікі нашага універсітэта. Узначальваў паход загадчык кабінета гісторыі КПСС кафедры прыродазнаўчых факультэтаў У. П. Белакосаў.*

*Перад групай стаяла задача праехаць па паўночных абласцях нашай Радзімы і расказаць аб дасягненнях Беларусі за 50 год, гісторыі камсамола БССР. Пачэснае даручэнне выканана. Удзельнікі паходу прачыталі 26 лекцый, арганізавалі 8 сустрэч, правялі дзесяткі субяседаванняў. Імі падрыхтаван вялікі фоталетапіс. Па просьбе нашай рэдакцыі «фотадакументаліст», старшы інжынер АН БССР Мірaслаў Грышчук згадзіўся прадставіць у нашай газеце некалькі здымкаў.*

*На першым вы бачыце старт калоны матацыклістаў на стадыёне «Дынама» сталіцы Беларусі. Кіраўнік паходу Уладзімір Белакосаў рапартуе адказнаму супрацоўніку ЦК камсамола Беларусі В. В. Грышчанку аб гатоўнасці ўдзельнікаў да ад'езду. На другім — песня на развітанне ў архангельскім камсамольскім лагеры «Факел». Далей «схоплен» момант перад уездам у Петразаводск — сталіцу Карэльскай рэспублікі. Ззаду 2 000 кіламетраў. За поспехі ў палітыка-выхаваўчай рабоце ў час паходу трое беларусаў былі запрошаны на IV Усесаюзны злёт пераможцаў паходу ў Кіеў.*

*На чацвёртым здымку вы бачыце дэлегатаў Беларускай рэспублікі сярод ганаровых гасцей злёту — старэйшага беларускага камсамольца Героя Савецкага Саюза віцэ-адмірала ў адстаўцы Г. Н. Халасцякова і дэлегата III з'езда РКСМ М. У. Разанава... На апошнім здымку — прэзідыум злёту ў Кіеве. Сярод яго членаў лётчык-касманаўт Герман Цітоў, двойчы Герой Савецкага Саюза В. І. Конеў, праслаўлены снайпер Герой Савецкага Саюза Людміла Паўлічэнка, віцэ-адмірал Г. Н. Халасцякоў, маці Зоі і Шуры Любоў Касмадзям'янская.*

*Падрабязны матэрыял аб паходзе будзе надрукаван у наступным нумары нашай газеты.*

# ВЕРНЫ СЫН ЛЕНІНСКАЙ

ВЛКСМ 50

**ПАРТЫЯ І КАМСАМОЛ...**

Кроўную сувязь паміж імі вобразна выказаў Мікалай Астроўскі. «У маім партыйным білеце,—пісаў ён,—ляжыць яго маленькі сынок—членскі білет Ленінскага камсамола...».

Так, камсамол — верны сын ленінскай партыі. Ён створан і выпеставан Камуністычнай партыяй, усімі сваімі поспехамі абавязан яе мудраму кіраўніцтву.

Усё жыццё камсамола непарыўна звязана з імем Уладзіміра Ільіча Леніна. Камуністычны Саюз Моладзі з гонарам носіць імя Леніна. ВЛКСМ абавязан Уладзіміру Ільічу распрацоўкай тэорыі, тактыкі і праграмы юнацкага руху. Яшчэ ў лістападзе 1895 года ў газеце «Самарский вестник» быў надрукаван артыкул У. І. Леніна «Гимназическое хозяйство и исправительные гимназии». Гэта першы ленінскі твор аб маладым пакаленні працоўных Расіі, а ўсяго Уладзімір Ільіч напісаў звыш ста работ, прысвечаных моладзі. Вялікі правадыр рабочага класа адклікаўся на кожны факт самавольства царскіх улад у адносінах да працоўнай моладзі, горача вітаў яе актыўны ўдзел у рэвалюцыйным руху.

Праз усе работы У. І. Леніна чырвонай ніткай праходзіць думка: неабходна дапамагчы моладзі авалодаць суцэльным навуковым, рэвалюцыйным светапоглядам. Гэтая ідэя знайшла сваё лагічнае завяршэнне ў гістарычнай прамове Уладзіміра Ільіча на III з'ездзе РКСМ, стаўшай, як падкрэсліваецца ў Пастанове ЦК КПСС аб 50-годдзі камсамола, «важнейшым тэарэтычным дакументам марксізма-ленінізма аб ролі моладзі ў будаўніцтве новага грамадства, праграмай камуністычнага выхавання падрастаючага пакалення». У сваёй прамове У. І. Ленін падкрэсліў, што **пярвейшая задача камсамола і моладзі заключаецца ў тым, каб вучыцца камунізму.**

У адносінах да моладзі Камуністычная партыя выконвае ролю мудрага настаўніка, дарадчыка. Яна ўдзяляе пастаянную ўвагу прапагандысцкай, агітацыйнай і арганізацыйнай рабоце сярод юнацтва. Ужо стала традыцыяй, што ўсе вядомыя дзеячы КПСС, мясцовыя кіруючыя партыйныя, савецкія, гаспадарчыя работнікі сістэматычна выступаюць перад моладдзю, перадаюць ёй вопыт і веды. У сетцы камсамольскай палітасветы штогод працуе вялікі атрад камуністаў-прапагандыстаў. У нашай рэспубліцы, напрыклад, у мінулым вучэбным годзе прапагандысцкую работу сярод моладзі вялі звыш трох тысяч камуністаў — амаль 60 працэнтаў усіх працуючых у камсамоле прапагандыстаў.

У гэтым годзе, асабліва пасля красавіцкага Пленума ЦК КПСС, звярнуўшага ўвагу на неабходнасць далейшага рашучага ўзмацнення камуністычнага выхавання працоўных, дапамога камсамолу ў ідэйна-выхаваўчай рабоце сярод моладзі яшчэ больш узрасла. Нядаўна ЦК Кампартыі Беларусі прыняў пастанову аб мерах паляпшэння палітычнай вучобы камсамольцаў і моладзі рэспублікі. Асноўная ўвага ў палітычным выхаванні маладога пакалення звяртаецца на глыбокае вывучэнне ім марксісцка-ленінскай тэорыі, гісторыі і палітыкі КПСС, біяграфіі У. І. Леніна, гісторыі ВЛКСМ. ЦК КПБ прызнаў неабходным лепшых, найбольш вопытных прапагандыстаў з сеткі партыйнай асветы накіраваць у новым навучальным годзе кіраўнікамі камсамольскіх семінараў і гурткоў, а таксама максімальна прыцягнуць да палітычнага выхавання моладзі кіруючыя кадры, выкладчыкаў вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў, спецыялістаў народнай гаспадаркі.

Неабходнасць удасканалення палітычнага выхавання моладзі на сучасным этапе дыктуецца абвастрэннем ідэалагічнай барацьбы з імперыялізмам. У. І. Ленін заклікаў ахоўваць моладзь ад «фальшывых сяброў», дапамагаць ёй выпрацоўваць навуковы светапогляд. Пры гэтым ён асабліва падкрэсліваў важнасць развіцця самастойнасці і ініцыятывы моладзі. Уладзімір Ільіч пісаў, што «без поўнай самастойнасці моладзь не зможа выпрацаваць з сябе добрых сацыялістаў, ні падрыхтавацца да таго, каб весці сацыялізм наперад».

На павышэнне ролі і самадзейнасці камсамола ў камуністычным будаўніцтве ўказвае і Праграма КПСС, прынятая XXII з'ездам партыі.

Партыйная арганізацыя універсітэта надае вялікае значэнне рабоце камсамола па выхаванню студэнцтва.



## А БЫЛО ТАК...

Камсамольцам дваццатых гадоў выпала на долю шмат цяжкасцей — ва ўмовах разрухі, калі не хапала самага неабходнага, ім прыйшлося разам са старэйшымі будаваць новае жыццё, ісці па нязведаных шляхах і разам з тым са зброяй у руках змагацца з недабітымі ўнутранымі ворагамі. Сучасная моладзь здзіўляецца, як мы маглі паспяваць усюды — і весці барацьбу з кулацкімі бандамі, і ствараць хаты-чытальні, гурткі па ліквідацыі непісьменнасці, будаваць дарогі і школы і дапамагаць беднякам збіраць ураджай... І ўсё ж адказ на гэтае пытанне ёсць. Перамагаць неймаверныя цяжкасці, смела ісці наперад нам дапамагаў прыклад бацькоў, старэйшых братоў — усіх тых людзей, камуністаў і не камуністаў, якія зверглі эксплуататараў, у жорсткай схватцы адстаялі ўладу народа. Мы вучыліся ў іх мужнасці, працавітасці, перакананасці ў справядлівасці і жыццятворнасці ідэй Леніна, партыі і, канешне, калектыўнай згуртаванасці.

Успамінаюцца гады вучобы ва універсітэце. Мы, камсамольцы і маладыя члены партыі, не зрабілі б і дзесятай долі таго, што паспелі, калі б не згуртаванасць, калегіяльнасць у рашэнні любога пытання. Калектыў дапамагаў у вучобе, калектыў без памылак назначаў месца ў інтэрнаце, калектыў, нарэшце, гаварыў рашаючае слова пры размеркаванні на працу пасля заканчэння універсітэта. Мяне, напрыклад, агульны сход рэкамендаваў на навукова-даследчую работу, чым і даў правільны кірунак на ўсё жыццё.

Нам, камсамольцам 20-х гадоў, прыемна ўсведамляць, што лепшыя традыцыі ленінцаў першых эшалонаў, калі можна так сказаць, цяпер жывуць і развіваюцца. Ды і мы, атрымаўшы такую загартоўку, нягледзячы на ўзрост, адчуваем сябе па-ранейшаму паўнапраўнымі членамі шматмільённай арміі Ленінскага камсамола.

І. ЛУШЧЫЦКІ,
прафесар, камсамолец 20-х гадоў.



## ЗА ШЧАСЦЕ Ў КОЖНЫМ ДОМЕ

Не ведаю, які лёс напаткаў бы мяне, вясковую дзяўчыну, калі б не Кастрычніцкая рэвалюцыя, якая адкрыла ўсёй савецкай моладзі дарогу ў навуку. У ліку многіх юнакоў і дзяўчат, якія прагна імкнуліся да ведаў, мне, унучцы, дачцы беднага селяніна, у 16 год пашчаслівілася закончыць Мсціслаўскае педагагічнае вучылішча. Я стала настаўніцай.

Камсамольскае жаданне падказвала паехаць у глыб Палесся, туды, дзе некалі настаўнічаў Якуб Колас. Тут, у глухой вёсцы, што згубілася сярод топкіх балот і сініх бароў, пачынаўся мой самастойны працоўны шлях.

Адгучалі на Палессі баі з польскай белагвардзейшчынай, было трывожна ў гэтым глухім, «забытым богам і людзьмі» краі. Даводзілася не толькі весці заняткі ва ўсіх чатырох класах Капліцкай школы, размешчанай у старэнькай хацінцы, але і змагацца разам з маімі сябрамі-камсамольцамі з забабонамі ў вёсцы, арганізоўваць драмгурток, расказваць пра новае жыццё, а вечарам пры святле лучыны вучыць пісьменнасці бацькоў сваіх вучняў. Хацелася данесці святло Кастрычніка ў кожную сялянскую хату. Работы было хоць адбаўляй, але і энергіі ў нас, тады яшчэ нямногіх камсамольцаў палескай вёскі, таксама было багата.

Марудна, але ўпэўнена мянялася аблічча Палесся. І тым большым станавілася жаданне вучыцца. 1927 год —гэта незабыўны час у маім жыцці: я паступіла на філалагічны факультэт БДУ. Паявілася яшчэ большае жаданне не толькі вучыцца, але і разам з вялікай арміяй студэнтаў-камсамольцаў займацца грамадскімі справамі. Сёння, аглядваючыся назад у незабыўнае студэнцкае юнацтва, нельга не ўспамінаць аб ім з хваляваннем. На ўсё жыццё яно пакінула ў душы майго пакалення агонь бадзёрасці і энергіі.

Л. ФІГЛОЎСКАЯ,
прафесар.



На долю нашага пакалення выпала самая цяжкая і гераічная задача — адстаяць Радзіму ад нашэсця лютага фашызму. У дні Вялікай Айчыннай вайны, калі ўвесь наш народ падняўся на барацьбу з акупантамі, наперадзе заўсёды была моладзь. Пакаленне Аляксандра Матросава і Аляксея Марэсьева, Зоі Касмадзям'янскай і Лізы Чайкінай, праслаўленых лётчыкаў Кажадуба і Пакрышкіна, маладагвардзейцаў Краснадона і ўсіх вядомых і невядомых байцоў ахвяравала сябе дзеля жыцця на зямлі.

Я ўспамінаю зараз сваіх баявых сяброў камандзіра нашай эскадрыллі Пятра Жалібу і штурмана Андрэя Маслава, якія гераічна загінулі за свабоду і незалежнасць Айчыны. І тых, хто прайшоў праз усе выпрабаванні, тых, чые раны і па

## Пераклічка








# ПАРТЫІ

На пасяджэннях партыйнага камітэта сістэматычна абмяркоўваюцца пытанні, звязаныя з дзейнасцю камсамольскіх арганізацый на факультэтах, курсах і ў групах. Партком удзяляе многа ўвагі фарміраванню ў моладзі савецкага патрыятызму, выхаванню юнакоў і дзяўчат на слаўных рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцыях народа.

Цяпер наша моладзь непамерна вырасла ў ідэйных і культурных адносінах. Калі ў 1926 годзе ў ЛКСМ Беларусі толькі асобныя камсамольцы мелі вышэйшую адукацыю, то цяпер звыш паловы членаў ЛКСМБ маюць вышэйшую, сярэднюю і незакончаную сярэднюю адукацыю. Толькі ў нашым універсітэце авалодвае ведамі каля васьмі тысяч камсамольцаў. Многія з іх ужо ў сценах універсітэта становяцца вопытнымі актывістамі.

За апошнія два гады, дзякуючы клопатам ЦК КПБ, партыйнае ядро ў радах ЛКСМБ павялічылася больш чым на дзве тысячы чалавек. Гэта садзейнічае далейшай актывізацыі дзейнасці камсамольскіх арганізацый. Прыкладаў таму можна многа прывесці і па нашаму універсітэту. Усе яны сведчаць аб тым, што сіла камсамола — у паўсядзённым партыйным кіраўніцтве.

За пяцьдзесят год школу камуністычнага выхавання ў камсамоле прайшлі 100 мільёнаў юнакоў і дзяўчат нашай краіны. Цяпер у яго радах налічваецца 23 мільёны чалавек. Роля ВЛКСМ як масавай палітычнай выхаваўчай арганізацыі расце з кожным годам. Далейшае яго развіццё забяспечыць новыя выдатныя поспехі Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі ў барацьбе за справу партыі, за перамогу светлых ідэалаў камунізма.

**А. ЖУРАЎ,**
**доктар гістарычных навук.**

# СВЕДЧЫЦЬ ГІСТОРЫЯ

*Студэнты нашага універсітэта жыва цікавяцца гісторыяй ВЛКСМ, даследуюць яго гераічныя этапы. Нядаўна, напрыклад, рэспубліканскае журы і ЦК ЛКСМБ адзначылі граматай навуковую працу студэнткі другога курса журфака Святланы Алексіевіч на тэму «Камсамольска-маладзёжны друк Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны». Рэдакцыя папрасіла камсамолку выступіць на старонках нашай газеты.*

На маім родным Палессі гаманкія лясы яшчэ да гэтага часу захавалі памяць аб былых баях. І часам мне здаецца, што ў хоры песень — гэтых сведак стольскіх падзей мінулага, я чую трохі журботную, але мужную мелодыю: «Ой бярозы ды сосны, партызанскія сёстры...».

Цяжкае выпрабаванне выпала на долю ўсяго савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. К канцу жніўня 1941 года вораг захапіў амаль усю тэрыторыю Беларусі. Але акупанты былі не ў сілах пакарыць беларускі народ. З кожным днём на часова акупіраванай тэрыторыі рэспублікі шырылася партызанская барацьба. Камсамол Беларусі, як і ў гады мірнага будаўніцтва, паказаў сябе верным памочнікам партыі. Адначасова з першымі залпамі народных мсціўцаў ва ўвесь голас загаварыў і падпольны друк. Сакратары ЦК ЛКСМБ М. В. Зімянін, К. Т. Мазураў, Ф. А. Сурганаў непасрэдна кіравалі маладзёжнымі выданнямі.

Падпольны друк паведамляў насельніцтву праўдзівыя звесткі аб становішчы на франтах, расказваў аб мужнай барацьбе партызан, выкрываў ілжывую фашысцкую прапаганду.

Усяго ў 1944 годзе ў тыле нямецка-фашысцкіх акупантаў у Беларусі выдавалася 165 падпольных газет. Дзесяць з іх былі камсамольска-маладзёжнымі.

Першы падпольны нумар беларускай маладзёжнай газеты «Чырвоная змена» выйшаў 31 студзеня 1943 года.

Газета дастаўлялася ў Мінск, Брэст, Баранавічы, Магілёў, Пінск, Мозыр. Цяжка назваць такі беларускі горад, куды б не пранікала «Чырвоная змена». Насельніцтва зачытвала кожны нумар літаральна да дырак. Газетныя лісты часта можна было ўбачыць на тэлеграфных слупах, у вёсках. Мінчанам добра памятны той дзень, калі некалькі нумароў «Чырвонай змены» падпольшчыкі вывесілі на памяшканні мінскага гестапа.

На старонках «Чырвонай змены» часта выступалі са сваімі творамі вядомыя беларускія пісьменнікі Пятро Глебка, Якуб Колас, Кандрат Крапіва, Пімен Панчанка. Усхваляваныя радкі іх твораў, нібы полымя, абпальвалі маладыя сэрцы, клікалі моладзь да барацьбы.

С. АЛЕКСІЕВІЧ.

# У БАЯХ АДСТАЯЛІ ВЯСНУ ДАРОГАЙ НАВУКОВАЙ СЛАВЫ ПАКАЛЕННЯЎ

гэты час яшчэ напамінаюць аб мінулых днях, тых, хто, верны клятве, дадзенай на магілах сяброў, адпомсціць за кроў і слёзы, а мары загінуўшых ператворыць у жыццё.

З гонарам выконваюць свой пачэсны мірны абавязак былыя воіны дацэнт А. І. Сідарэнка, дэкан гістфака П. З. Савачкін, воіны-жанчыны дацэнты В. А. Захарава, С. А. Лысенка, В. М. Цімафеева, выкладчык фотарэпартажу, былы партызан Г. З. Бягун і многія іншыя.

Гады вайны—яркая старонка гераічнага летапісу беларускага камсамола, які за мужнасць і гераізм, праяўленыя ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, атрымаў ордэн Баявога Чырвонага Сцяга.

Р. БУЛАЦКІ,
дацэнт, дэкан факультэта журналістыкі.



**Майму пакаленню, камсамольцам 50-х гадоў, не прыйшлося змагацца ні з кулацкімі бандамі, ні з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Але ў гісторыю камсамола, у гісторыю нашай Радзімы яно таксама ўпісала многа яркіх, незабыўных старонак. Мы былі першым пакаленнем, якое жыло ў мірны час. Але час ад гэтага не пераставаў быць гераічным. Камсамольцы 50-х гадоў асвойвалі мільёны гектараў цалінных зямель у Казахстане і на Алтаі, пакаралі суровыя рэкі Сібіры, пракладвалі нафтаправод «Дружба». Сам космас адкрыў свае тайны і вабячыя далі героям-касманаўтам камсамольцам Юрыю Гагарыну і Герману Цітову, Валянціне Церашковай і Валерыю Быкоўскаму. Здзейснілася мара Цыялкоўскага, бацькі касманаўтыкі.**

**У савецкую навуку ўвайшла новая змена, дастойная сваіх бацькоў. Хочацца сказаць пра сваіх сучаснікаў, выпускнікоў нашага універсітэта. Далёка за межамі Беларусі вядома імя прафесара Уладзіміра Платонава. Плённа працуюць ва універсітэце і былыя камсамольцы 50-х гадоў, цяпер кандыдаты навук П. Манастырны, У. Пракошын, М. Талкачоў, І. Сяргееў, Р. Малюковіч, У. Ціток, У. Рагойша, выкладчыкі М. Піліпенка, М. Елісееў, Ф. Варанковіч, П. Салаў, Г. Рылюк і многа іншых.**

**У дзень слаўнага 50-годдзя Ленінскага камсамола, у дзень агляду яго баявых сіл хочацца выказаць пажаданне, каб сённяшнія камсамольцы, якія вучацца ва універсітэце, не забывалі слаўных традыцый сваіх папярэднікаў, свята выконвалі запаветы У. І. Леніна.**

**І. СТАДУБ,**
**аспірант,**
**камсамолец 50-х гадоў.**

# ЭСТАФЕТА БАЦЬКОЎ— У НАДЗЕЙНЫХ РУКАХ



Бываюць у жыцці кожнага такія мінуты, калі словы становяцца якімісьці бледнымі ў выражэнні асабліва ўзнёслых пачуццяў. Мабыць, такое здарылася і са мною, калі атрымаў запрашэнне рэдакцыі прыняць удзел у пераклічцы пакаленняў. Прыкра было б ударыцца і ў патэтыку, расказваючы аб сваіх сябрах, аб іх вучобе і справах, адным словам, аб той «весомой, грубой, зримой» паўсядзённасці...

А чаму ж прыкра? Падводзячы вынікі пройдзенаму, чалавек глядзіць на жыццё вачыма гісторыка: «прасуе» факты, выкідвае наноснае і пакідае касцяк. Міша, Валодзя, Федзя—ужо не проста мае таварышы з іх здольнасцямі і слабасцямі, а ўвасабленне тыповага і сучаснага, што характарызуе ўсё наша пакаленне, ва ўсякім разе цэлай сацыяльнай групы—студэнцтва. Тут перад намі тая самая дыялектыка агульнага і адзіночнага, з якімі мы знаёмы па вучэбніках дыямата. Выявіць гэтую дыялектыку, выражаную ў загалоўку, лепш за ўсё на прыкладзе студэнтаў нашай групы.

...На факультэце яго ведае амаль кожны. Мне ўспамінаецца цяпер спрэчка з Таццянай Глушаковай, сакратаром камітэта камсамола гістфака. Спрэчка была безнадзейнай для нас, філосафаў трэцяга курса, якія не хацелі адпускаць у факультэцкі камітэт камсамола Валодзю Кузьмінова. Наш групавы сход аднагалосна выбраў яго камсоргам, і вось цяпер мы «біліся» за яго. Таня гаварыла, што інтарэсы факультэта павінны быць вышэй за ўсё, што мы сепаратысты і г. д. Адчуваючы яе правату, падначаліцца якой нам не хацелася, мы адвяргалі ўсе яе аргументы. І толькі з адным мы вымушаны былі згадзіцца — з ацэнкай Валодзі. Так, Кузьміноў вельмі здольны студэнт, выдатны актывіст, кожная рыса яго характару быццам бы незнарок адпавядае патрабаванням грамадскай дзейнасці. Валодзя—чалавек вялікай унутранай самадысцыпліны. У неафіцыйных спаборніцтвах па пытаннях удзелу ў грамадскім жыцці, як падлічыў па толькі для яго вядомай сістэме стараста групы Фёдар Лазюк, Валодзя заняў першае месца ў групе.

Мне вельмі дарагое сяброўства з Валодзем. Іменна гэта прымушае мяне стрымацца ў пахвалах. Да таго ж, акрамя пералічаных «плюсоў», для Валодзі характэрна вялікая сціпласць, тая сціпласць, якая не церпіць пахвальных фраз.

Змест жыцця савецкага студэнцтва бязмерны, але касцяком яго заўсёды, безумоўна, з'яўляецца вучоба. З усёй рэспублікі з'язджаюцца на вучобу ва універсітэт беларускія юнакі і дзяўчаты. Прыехаў сюды з вёскі Грабаўка, што на Гомельшчыне, і Міша Віннікаў—залаты медаліст. Дома яму прыходзілася нялёгка. Як-ніяк—адзін здаровы мужчына ў царстве чатырох дзяўчат-сясцёр. Бацька—інвалід Вялікай Айчыннай вайны. Праца ў калгасе загартавала ў ім любоў да роднай зямлі. Мяне больш за ўсё уражваюць яго ўсебаковыя здольнасці. У ім няма ні ценю скаванасці, уласцівай некаторым вясковым хлопцам. З першых дзён заняткаў уся група пранікласа да яго павагай. Першым на курсе Міша ўключыўся ў навукова-даследчую работу і хутка ў гэтых адносінах дасягнуў вялікіх поспехаў. З другога курса я пазнаёміўся з ім бліжэй. Справа ў тым, што мы вельмі часта былі адной думкі на семінарскіх занятках. Вось тады і ўзнікла ідэя творчай садружнасці. Над конкурснай навуковай працай мы сталі працаваць разам. Прызнаюся, што найбольш цяжкая частка работы дасталася Міхаілу. Мне вельмі прыемна было днямі паказаць яму папярэдні нумар газеты «Беларускі універсітэт», у якім гаварылася аб узнагароджанні нашай працы граматай Міністэрства. Нягледзячы на вялікую занятасць вучобай (Міша займаецца толькі на выдатна), Віннікаў актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці універсітэта. Нядаўна ён выбран членам камітэта камсамола гістфака.

Я расказаў толькі аб двух аднакурсніках. Многа цікавага можна было б сказаць і аб Анатолю Зелянкове, Галіне Санюк, Тадэушу Адуле і многіх іншых сябрах-камсамольцах. Наогул, мне здаецца, я маю поўнае права заявіць, што эстафета нашых бацькоў знаходзіцца сапраўды ў надзейных руках.

Ю. ШЫНКАР,
студэнт III курса філасофскага аддзялення,
стыпендыят стыпендыі імя К. Маркса.



# ЯК ЗАВЯШЧАЎ ІЛЬІЧ

Уладзімір Ільіч Ленін, імя якога носіць наш Камуністычны Саюз Моладзі, марыў аб тым часе, калі падрастаючае пакаленне атрымае ўсе магчымасці для таго, каб расці ўсебакова развітымі людзьмі. Вызначаючы задачы па камуністычнаму выхаванню моладзі, ён надаваў вялікае значэнне фізічнай загартоўцы юнакоў і дзяўчат.

Яскравым прыкладам здзяйснення партыяй, усім савецкім народам запаветаў Ільіча можа служыць наш універсітэт. Тут створаны выдатныя ўмовы не толькі для глыбокага авалодання тэарэтычнымі ведамі, практычным вопытам сваёй будучай спецыяльнасці, але і для развіцця масавага спорту. У распараджэнні студэнтаў — цудоўныя залы для заняткаў і трэніровак, разнастайны спартыўны інвентар. Умацоўваць здароўе, набываць і павышаць сваё майстэрства ў шматлікіх спаборніцтвах ім дапамагае вялікі атрад добра падрыхтаваных выкладчыкаў.

Значную работу па прапагандзе і развіццю фізкультуры і спорту вядуць агульнауніверсітэцкі спартыўны клуб і адзіны ў вышэйшых навучальных установах краіны шашачны клуб. Яны, як і кафедра фізвыхавання і спорту, адчуваюць паўсядзённыя клопаты і дапамогу рэктарата, партыйнага камітэта. Іменна такая ўвага да здароўя студэнтаў прыносіць выдатныя вынікі, бо спорт дапамагае студэнтам лепш вучыцца, адпачываць, рыхтаваць сябе да працы. Што датычыць спартыўных поспехаў, то яны не могуць не парадаваць, хоць яшчэ не ўсе магчымасці выкарыстоўваюцца ў поўнай меры.

Універсітэцкія спартсмены добра адстойваюць гонар свайго калектыву не толькі ў рэспубліцы, але і за яе межамі. Многія з іх з'яўляюцца прызёрамі адказных спаборніцтваў. І, канешне, заўсёды наперадзе ідуць камсамольцы. Сёння, напярэдадні слаўнага юбілею, хочацца назваць імёны некаторых з іх. Гэта майстар спорту, выдатніца з фізфака Таня Чупракова, кандыдат у майстры Аляксандр Багданаў з юрфака, капітан універсітэцкай каманды па ручному мячу Наталля Бабаеўская з хімфака, майстар спорту Барыс Сабанееў з гістфака, чэмпіён СССР па кіданню молата майстар спорту Ігар Соўпель з матфака і многія іншыя.

Выкладчыкі і трэнеры Г. М. Грудо, Б. М. Гарбатаў, В. І. Бычкоў, В. Н. Фефелаў, В. В. Нікішын, В. Ф. Кавалёў, М М. Кучынскі, А. І. Яфімаў, Е. Г. Стралецкі, Р. І. Васілеўскі, В. М. Собалева, В. С. Хрэнаў, Ю. М. Малочка называюць дзесяткі імёнаў першаразраднікаў, майстроў спорту, якія дасягнулі немалых поспехаў у час напружаных рэспубліканскіх і ўсесаюзных спаборніцтваў. У невялікім артыкуле няма магчымасці назваць усе прозвішчы, але хочацца сардэчна павіншаваць усіх з юбілеем камсамола, пажадаць нашай спартыўнай моладзі новых перамог.

І яшчэ хочацца адзначыць тых, хто, скончыўшы універсітэт, не парывае сувязей са сваёй спартыўнай сям'ёй. Марыта Шчарбініна, якая пасля заканчэння матфака працуе ў Акадэміі навук БССР, выкладчыкі Анатоль Сакольскі, Уладзімір Ціток і іншыя—надзейная апора універсітэцкіх аматараў спорту. Карацей, ва універсітэце не толькі створаны неабходныя ўмовы для заняткаў спортам, але і ёсць людзі, з якіх можна і патрэбна браць прыклад. Запаветы Уладзіміра Ільіча Леніна і сёння з'яўляюцца дзейснай праграмай барацьбы за духоўна багатага, фізічна моцнага, прыгожага ва ўсіх адносінах чалавека — будаўніка камуністычнага грамадства.

**В. ЯКАНЕН,**
**ст. выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту.**

# ВАХТА ПРАЦЯГВАЕЦЦА

*Амаль ва ўсіх школах рэспублікі працуюць выпускнікі нашага універсітэта. Людміла Іванаўна Валынец закончыла аддзяленне рускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта ў 1966 годзе і паехала працаваць у Аталезскую сярэднюю школу. У гэтых мясцінах калісьці настаўнічаў вядомы паэт Якуб Колас.*

*Многа прыйшлося папрацаваць маладой настаўніцы, каб заваяваць душы і сэрцы сваіх вучняў. Яе урокі заўсёды вызначаліся глыбінёй і навуковай абгрунтаванасцю. Неўзабаве Людмілу Іванаўну як выдатнага педагога, умелага арганізатара назначылі дырэктарам школы. Так камсамолка стала кіраўніком калектыву. Цяпер у Людмілы Іванаўны больш спраў, больш грамадскіх нагрузак. Трэба ўсюды паспець: правесці бацькоўскі сход, пагаварыць з вучнямі, наведаць урокі, падумаць над планамі. А вечарам, калі вясковая вуліца акунецца ў цемру, яна спяшаецца ў сельскі клуб. Тут чакае рэдакцыйная калегія калгаснай газеты «Ураджай», якую рэдагуе Людміла Іванаўна Валынец.*

*Нядаўна дырэктар школы Людміла Іванаўна Валынец пабывала на родным факультэце. Яна сустрэлася са знаёмымі студэнтамі, з выкладчыкамі. Сардэчнай была гутарка з дацэнтам Верай Анісімаўнай Захаравай, пад кіраўніцтвам якой Л. І. Валынец напісала выдатную дыпломную работу. Дружба з выкладчыкамі і цяпер дапамагае Людміле Іванаўне дастойна несці сваю камсамольскую вахту.*

*НА ЗДЫМКУ: дырэктар Аталезскай сярэдняй школы Людміла Іванаўна Валынец.*

*Фота і тэкст*
*І. АСКІРКІ.*

# ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦЬ ДА НАШАЙ ГІСТОРЫІ

**На пытанні журналіста з Чылі Віктара Сандаваля, рэдактара студэнцкага часопіса «Універсітэцкія сшыткі» і карэспандэнта нігерыйскай рабочай газеты «Прагрэс» Джыммі Чыджыоке аб падрыхтоўцы журналісцкіх кадраў у Беларусі адказалі дэкан факультэта журналістыкі дацэнт Р. В. Булацкі, дацэнт Я. Л. Бондарава і самі студэнты.**

Ва універсітэце адбылася сустрэча паміж выкладчыкамі, студэнтамі журфака, членамі камітэта камсамола і прыехаўшымі ў Мінск замежнымі журналістамі. Сустрэча прайшла ў цёплай і сардэчнай абстаноўцы.

Аб гістарычным шляху універсітэта гасцям расказаў сакратар камітэта камсамола Міхаіл Ціва.

Пасля гутаркі госці агледзелі спартыўныя залы і бібліятэку, вылічальны цэнтр і навуковыя лабараторыі.

# МІТЫНГ ДРУЖБЫ

У нашай краіне праходзіць тыдзень умацавання дружбы і салідарнасці з в'етнамскім народам. Мнагалюдна было ў актавай зале ў сераду. Тут сабраліся выкладчыкі і студэнты. Выступіўшыя на мітынгу прарэктар А. Я. Малышаў, намеснік дэкана фізфака А. А. Лабуда, старшы выкладчык падрыхтоўчага факультэта Э. М. Мазуркевіч, савецкія і замежныя студэнты з гневам і абурэннем гаварылі аб варварскіх дзеяннях амерыканскай ваеншчыны ў Паўднёвым В'етнаме, аб актах агрэсіі імперыялістаў супраць ДРВ.

Прамоўцы падкрэслівалі, што ўвесь савецкі народ, працоўныя ўсяго свету рашуча падтрымліваюць справядлівую барацьбу гераічнага в'етнамскага народа за сваю свабоду і незалежнасць, за светлае будучае сваёй краіны. Прэзідэнт зямляцтва кубінскіх студэнтаў Барыс Ла Сэрна расказаў аб сумесных нядзельніках кубінскіх і в'етнамскіх юнакоў і дзяўчат. Заробленыя грошы яны адсылаюць у фонд абароны В'етнама. У сумеснай працы расце і мацнее іх дружба.

На мітынгу са словам у адказ выступіў в'етнамскі студэнт пятага курса матфака Дзін Хак Фунг. Ён паведаміў аб новых фактах амерыканскага разбою на тэрыторыі гераічнай рэспублікі, шчыра падзякаваў за падтрымку і дапамогу, якую аказваюць Савецкі Саюз і іншыя сацыялістычныя краіны в'етнамскаму народу. Удзельнікі мітынгу прынялі рэзалюцыю, у якой патрабуюць спынення вайны у В'етнаме.

# РАМАНТЫКА І БУДНІ

Чалавечая мужнасць... Асляпляльная і непрыкметная, шматгранная і зачароўваючая сваёй бязмежнасцю.

Любоў... Свая асабістая і грамадзянская — святая любоў да сваёй Радзімы.

Дзе межы паміж сапраўдным, глыбокім і тым, што толькі здаецца такім? Вечныя пытанні, векавечная размова аб іх. Сёння яе прадаўжаюць камсамольцы беларускага універсітэта. «Дзеля жыцця на зямлі» — пад такім дэвізам 22 кастрычніка праходзіла агульнауніверсітэцкая канферэнцыя чытачоў, прысвечаная 50-годдзю ВЛКСМ. Гэты своеасаблівы форум лірыкаў адкрыў кандыдат філалагічных навук дацэнт У. С. Карабан. Ён цёпла вітаў прысутных з наступаючым святам савецкай моладзі.

Аб яркім жыцці і натхняючай творчасці камсамольскіх паэтаў М. Святлова і А. Безыменскага гаварылі Мікалай Паўлавец і Мікалай Гарбун. Жана Малашэвіч і Нэла Шарлай расказалі аб тым вялізным пачуцці ўдзячнасці, якую заслужыў у гады Вялікай Айчыннай вайны ў савецкіх людзей Канстанцін Сіманаў стварэннем сваіх цудоўных твораў аб дружбе, любві і вернасці. Любу Дарогіну, якая пазнаёміла нас з Уладзіславам Цітовым, які паўтарае цяпер жыццёвы і творчы подзвіг Мікалая Астроўскага, зал слухаў з асаблівай увагай.

Усхвалявана гучаць вершы, вершы, ужо стаўшыя савецкай класікай, і зусім новыя, але ўжо спадабаныя і абышоўшыя краіну. Света Дзялец і Лаўранчук чытаюць урыўкі з паэмы Роберта Раждзественскага «Пісьмо ў XXX век».

«Как в огне беспримерного мужества закалялась душевная сталь», — гэтымі словамі закончыла свой верш аб Паўле Карчагіну Эла Якубоўская. Са сваімі новымі творамі, прысвечанымі подзвігам першых камсамольцаў, выступіла яшчэ адна маладая паэтэса — Ларыса Арманюк.

У той жа дзень на фізічным факультэце адбылася тэарэтычная канферэнцыя на тэму «Рамантыка і будні савецкай моладзі». Цікавыя паведамленні былі падрыхтаваны актыўным удзельнікам партызанскай барацьбы ў Беларусі, былым камсамольцам, дацэнтам М. Я. Рэзнікавым «Любоў да прафесіі — шлях да майстэрства», студэнтам гістфака Міхаілам Мядзведзевым — «Савецкі патрыятызм як выток рамантыкі», студэнтам фізфака Анатолем Рубанавым — «Студэнты і грамадскія прафесіі», студэнтам філасофскага аддзялення Юрыем Шынкаром — «Жывыя традыцыі камсамола».

В. ДУДКО,
аспірант кафедры гісторыі філасофіі і логікі.

У падрыхтоўцы гэтага нумара актыўны ўдзел прыняў былы выхаванец камсамольскай арганізацыі філфака аспірант кафедры гісторыі філасофіі і логікі загадчык камсамольскага аддзела нашай рэдакцыі Іван Рэкуц.



Напярэдадні камсамольскага юбілею кафедра гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў правяла са студэнтамі замежных краін, якія займаюцца на матэматычным факультэце універсітэта, экскурсію па гістарычных месцах сталіцы Беларусі. Студэнты пабывалі ў Доме-музеі І з'езда РСДРП, агледзелі рэвалюцыйныя помнікі Мінска.

НА ЗДЫМКУ: удзельнікі экскурсіі на плошчы Перамогі.

Фота У. БЕЛАКОСАВА.

# ТЫ НА ПОДЗВІГ КЛІЧАШ

Бібліятэка універсітэта арганізавала кніжную выстаўку, якая называецца «Ты на подзвіг клічаш, камсамольскі білет». Тут змешчаны творы Уладзіміра Ільіча Леніна, стэнаграмы з'ездаў і пленумаў партыі і камсамола, іншыя праграмныя дакументы. Шырока прадстаўлены творы пісьменнікаў, драматургаў, вучоных. Прыцягваюць увагу наведвальнікаў кнігі доктара гістарычных навук А. Я. Журава «У баях народжаны», Аляксандра Безыменскага «Уперад, зары насустрач», А. Жарава «Трыццаць пяць», Б. Барысава «Севастопальцы не здаюцца», К. Касценкі «Гэта было ў Краснадоне», М. Вестэрмана «Фронт без лініі фронту», былога генеральнага сакратара ЦК ВЛКСМ Аляксандра Мільчакова «Першае дзесяцігоддзе» і іншыя.

Заканчваецца гэтая цікавая выстаўка словамі з пастановы ЦК КПСС аб 50-годдзі камсамола: «Савецкай моладзі ёсць чым ганарыцца. У рэвалюцыйных, працоўных, ратных подзвігах, у багатым вопыце бацькоў яна бачыць прыклад для пераймання».

**А. ХАЗЯНІН,**
**студэнт 2 курса журфака.**

Адказны рэдактар
М. І. ІОСЬКА.

АТ 18629 Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон—Б-2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». Зак. 1836.